К@нтыненты

# РАСІЗМ, СТРАЛЬБА І ПАЛІЦЭЙСКІ ГВАЛТ

## Што з правамі чалавека ў ЗША?

**Прэс-канцылярыя Дзяржсавета КНР днямі апублікавала грунтоўны Даклад аб парушэннях правоў чалавека ў ЗША ў 2022 годзе. Аб гэтым са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа» паведаміла «Жэньмінь жыбао» анлайн». У дакуменце адзначаецца, што летась у Злучаных Штатах адбыўся гістарычны спад у галіне правоў чалавека. У краіне шырока распаўсюджаны хранічныя парушэнні ў гэтай сферы, такія як палітыка «залатога цяльца», расавая дыскрымінацыя, страляніна і паліцэйскі гвалт, а таксама адзначаецца крайняя палярызацыя даходаў. Тым не менш ЗША крывадушна называюць сябе «абаронцамі правоў чалавека». Што ж насамрэч адбываецца ў Штатах?**

### КРЫВАВЫ КАНВЕЕР

Злучаныя Штаты лідзіруюць у свеце па валоданні зброяй, забойствах з ужываннем агнястрэльнай зброі і масавых расстрэлах. Лічбы жудасныя: у мінулым годзе звыш 80 тысяч чалавек былі забіты ці паранены ў выніку гвалту з ужываннем агнястрэльнай зброі. Трэці год запар у Злучаных Штатах зарэгістравана звыш 600 масавых расстрэлаў.

Амаль палова штатаў ЗША паслабіла абмежаванні на нашэнне зброі. «У апошнія 20-30 гадоў краіна ў цэлым вельмі выразна і рэзка рухалася да паслаблення законаў аб нашэнні зброі», — заўважыў прафесар Вашынгтонскага ўніверсітэта Алі Роўхані-Рахбар. У кнізе амерыканскай вучонай Памэлы Хааг «Стральба ў Амерыцы: бізнес і стварэнне амерыканскай зброевай культуры» адзначаецца, што вытворчасць зброі ў Злучаных Штатах уяўляе сабой вытворчы ланцужок, які «пачынаецца з вытворчай лініі і заканчваецца смерцю ахвяр». «Трагедыя гвалту з ужываннем агнястрэльнай зброі ў Амерыцы сыходзіць сваімі каранямі ў векавы гандаль зброяй», — піша яна.

Гвалт з ужываннем агнястрэльнай зброі расце ў тандэме з валоданнем зброяй. Даследчыкі, якія апублікавалі артыкул у British Medical Journal, мяркуюць, што паслабленне кантролю над зброяй у ЗША прывяло да адначасовага росту колькасці ўладальнікаў зброі і масавых расстрэлаў. У ЗША пражывае менш за 5 працэнтаў насельніцтва планеты, пры гэтым у краіне засяроджана 46 працэнтаў грамадзянскай зброі свету. Злучаныя Штаты лідзіруюць па валоданні зброяй, забойствах з ужываннем агнястрэльнай зброі і масавых расстрэлах. Па даных сайта Gun Violence Archive, летась у ЗША адбылося 636 масавых расстрэлаў — у сярэднім па два выпадкі штодня. Узровень забойстваў з ужываннем агнястрэльнай зброі ў Амерыцы ў восем разоў вышэйшы, чым у Канадзе, у 13 разоў — чым у Францыі і ў 23 разы — чым у Аўстраліі. У калонцы, апублікаванай у Australian, адзначаецца, што Злучаныя Штаты «з'яўляюцца краінай, якую амаль цалкам вызначае гвалт у СМІ і на вуліцах». Гвалт з ужываннем агнястрэльнай зброі стаў «амерыканскай хваробай», адзначаецца ў дакладзе Прэс-канцылярыі Дзяржсавета КНР.

Колькасць цяжкіх злачынстваў, такіх як забойствы і рабаванні, працягвае расці. Газета USA Today паведаміла, што ў першай палове 2022 года колькасць забойстваў у гарадах — членах Асацыяцыі начальнікаў паліцыі буйных гарадоў павялічылася на 50 працэнтаў, а колькасць нападаў з абцяжарваючымі абставінамі — прыкладна на 36 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам 2019 года. Згодна з рэпартажам CNN, 72 працэнты амерыканцаў былі незадаволены палітыкай краіны па барацьбе са злачыннасцю, 80 працэнтаў жыхароў ЗША адзначаюць, што яны моцна ці значна занепакоеныя злачыннасцю і гвалтам. Такога паказчыка не назіралася ўжо больш за 10 гадоў.

### ЖЫЦЦЁ ПАД ПАГРОЗАЙ

Пашыраецца рэлігійная нецярпімасць. Згодна са статыстыкай злачынстваў на глебе нянавісці, апублікаванай Федэральным бюро расследаванняў напрыканцы мінулага года, у 2021-м у ЗША было зарэгістравана 1005 злачынстваў на глебе рэлігійнай нянавісці, з якіх 31,9 працэнта накіраваны супраць іўдзеяў, 21,3 працэнта — супраць сікхаў, 9,5 працэнта — супраць мусульман, 6,1 працэнта — супраць каталікоў і 6,5 працэнта — супраць праваслаўных.

Узмацняецца паліцэйскі гвалт. Па звестках вэб-сайта Mapping Police Violence, у мінулым годзе ў выніку паліцэйскага гвалту ў ЗША загінула рэкордная колькасць людзей — 1239 чалавек. На працягу года зафіксавана ўсяго 10 дзён, калі паліцэйскія не забілі ніводнага чалавека. Жыццё і здароўе зняволеных знаходзяцца пад пагрозай. У Злучаных Штатах самы высокі ўзровень узяцця пад варту ў свеце, а ўмовы ўтрымання ў турмах



проста жудасныя. Як паведаміла Guardian, у ЗША налічваецца амаль 500 зняволеных на 100 тысяч чалавек, што прыкладна ў пяць разоў больш, чым у Вялікабрытаніі, у шэсць разоў больш, чым у Канадзе, і ў дзевяць разоў больш, чым у Германіі. Турмы сталі цэнтрам сучаснага рабства. Паводле справаздачы, апублікаванай сумесна Школай юрыспрудэнцыі Чыкагскага ўніверсітэта і Амерыканскім саюзам грамадзянскіх свабод у чэрвені мінулага года, у турмах штатаў і федэральных турмах ЗША ўтрымлівалася звыш 1,2 мільёна чалавек.

Расізм знаходзіцца на ўздыме, і этнічныя меншасці падвяргаюцца шырока распаўсюджанай дыскрымінацыі. Колькасць злачынстваў на глебе нянавісці, заснаванай на расавай прадузятасці, у Злучаных Штатах рэзка ўзрасла ў перыяд з 2020 да 2022 года. Расісцкая разня ў супермаркеце ў Бафала, у выніку якой загінулі 10 афраамерыканцаў, узрушыла ўвесь свет. Больш чым 80 амерыканцаў азіяцкага паходжання адзначаюць, што гвалт у дачыненні да азіяцкіх абшчын пашыраецца. Верагоднасць таго, што афраамерыканцы будуць забіты паліцыяй, амаль у 2,8 раза вышэйшая, чым для белых. Пакуты, выкліканыя генацыдам і культурнай асіміляцыяй, гістарычна накіраваныя ўрадам супраць індзейцаў і іншых абарыгенаў, усё яшчэ захоўваюцца і зараз.

Рэзка скарацілася чаканая працягласць жыцця, а смяротнасць ад злоўжывання наркотыкамі працягвае павялічвацца. Паводле справаздачы, апублікаванай у жніўні мінулага года Нацыянальным цэнтрам статыстыкі аховы здароўя пры цэнтрах ЗША па кантролі і прафілактыцы захворванняў, сярэдняя працягласць жыцця ў Злучаных Штатах знізілася з 2019-га да 2021-га на 2,7 года — да 76,1 года, што з'яўляецца самым нізкім паказчыкам з 1996-га.

Колькасць амерыканцаў, якія паміраюць ад злоўжывання наркотыкамі і псіхаактыўных рэчываў, у апошнія гады рэзка ўзрасла і складае больш за 100 тысяч у год. Летась больш чым 5800 дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў атрымалі раненні або былі забіты ў выніку стральбы ў Злучаных Штатах, а колькасць школьных перастрэлак перавысіла 300, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам з 1970 года. Узровень дзіцячай беднасці ў Злучаных Штатах узрос з 12,1 працэнта ў снежні 2021-га да 16,6 працэнта ў маі 2022-га. Пры гэтым 3,3 мільёна дзяцей жывуць у крайняй галечы. З 2018 года ў Злучаных Штатах колькасць парушэнняў, звязаных з дзіцячай працай, узрасла амаль на 70 працэнтаў, а ў 2022-м фінансавым годзе было зарэгістравана 26-працэнтнае павелічэнне колькасці непаўналетніх, занятых на небяспечных вытворчасцях.

### «ЦЁМНЫЯ ГРОШЫ»

Амаль 38 мільёнаў чалавек знаходзяцца ў ЗША за рысай беднасці. Пры гэтым, як сведчыць статыстыка Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША, агульны капітал найбагацейшага 1 працэнта насельніцтва краіны дасягнуў рэкордных 45,9 трыльёна долараў напрыканцы чацвёртага квартала 2021 года. Ён павялічыўся больш чым на 12 трлн. долараў (больш чым на трэць) за час пандэміі COVID-19.

Прамежкавыя выбары сталі самымі дарагімі ў Злучаных Штатах, і «дэмакратыя ў амерыканскім стылі» страціла сваю народную падтрымку, канстатуюць аўтары даклада. Сукупныя выдаткі на іх у мінулым годзе перавысілі 16,7 мільярда долараў. Палітычныя ахвяраванні мільярдэраў склалі 15 працэнтаў ад агульнага федэральнага бюджэту ў параўнанні з 11 працэнтамі ў выбарчым цыкле 2020-га.

Ахвяраванні «цёмных грошай» таемна маніпулююць выбарамі, а палітычная палярызацыя і сацыяльная фрагментацыя абцяжарваюць дасягненне краінай дэмакратычнага кансэнсусу. Электаральны фарс і паслявыбарчы хаос сталі характэрнымі рысамі амерыканскай палітыкі. Палярызацыя партыйных рознагалоссяў і жорсткае саперніцтва прывялі да краху палітычнага даверу і выклікалі сур'ёзны крызіс кіравання ў Злучаных Штатах, піша прафесар паліталогіі ўніверсітэта Вандэрбільта Марк Дж. Хетэрынгтан.

Чыноўнікі карыстаюцца сваім становішчам у асабістых мэтах. Палітыкі высокага ўзроўню могуць загадзя атрымаць доступ да вялікай колькасці канфідэнцыяльнай інфармацыі, якая прынясе ім прыбытак. Так, уласны капітал былога спікера Палаты прадстаўнікоў Нэнсі Пеласі і яе мужа Пола Пеласі складае больш за 114 мільёнаў долараў. Большая частка іх капіталу атрымана ад інвестыцый, у прыватнасці ў акцыі і апцыёны, адзначае газета Hill.

За час знаходжання Нэнсі Пеласі на пасадзе кіраўніка Палаты прадстаўнікоў яе сям'я зарабіла каля 30 мільёнаў долараў на здзелках з удзелам буйных тэхналагічных кампаній, за рэгуляванне якіх яна адказвала. 183 з 435 кангрэсменаў у 2019—2022 гадах гандлявалі акцыямі самі ці праз найбліжэйшых сваякоў, паведаміла Daily Mail. Адзначаецца, што як мінімум 97 чалавек самастойна ці праз сваіх сужэнцаў купілі ці прадалі акцыі, аблігацыі ці іншыя фінансавыя актывы, наўпрост звязаныя з іх работай у Кангрэсе.

Грамадскі давер да амерыканскай дэмакратыі працягвае змяншацца. Амерыканскія навукоўцы Томас Р. Дай, Хармон Зейглер і Луі Шуберт у сваёй кнізе «Іронія дэмакратыі: незвычайнае ўвядзенне ў амерыканскую палітыку» адзначаюць, што нямногія амерыканцы цяпер вераць, што ўрад працуе на карысць народа. Большасць лічыць, што палітычная сістэма кіруецца некалькімі буйнымі верхаводамі ў іх уласных інтарэсах, пакідаючы сярэдняга чалавека за бортам.

PR Newswire паведаміла: пазапартыйнае апытанне More Perfect перад прамежкавымі выбарамі паказала, што 86 працэнтаў выбаршчыкаў заявілі: дэмакратыя ў ЗША сутыкаецца з вельмі сур'ёзнымі пагрозамі. 72 працэнты выбаршчыкаў ацанілі стан амерыканскай дэмакратыі як дрэнны, 64 працэнты заявілі, што ў палітыцы занадта шмат грошай, 61 працэнт лічыць, што палітыка карумпаваная, 58 працэнтаў — што занадта шмат прадузятай інфармацыі і дэзынфармацыі. Грамадскі давер працягвае імкліва змяншацца, што сведчыць аб страце падтрымкі сярод насельніцтва.

### РАСКОЛ І ХАОС

Злоўжыванне сілай і аднабаковыя санкцыі ЗША прывялі да гуманітарных катастроф. Некамерцыйнае амерыканскае СМІ Common Dreams апублікавала артыкул пад назвай «Уорэн і Джэйкабс абвінавачваюць Пентагон у значным заніжэнні колькасці грамадзянскіх асоб, забітых амерыканскімі вайскоўцамі», у якім паведамляецца, што, паводле даных брытанскай маніторынгавай групы Airwars, ЗША нанеслі амаль 100 тысяч авіяўдараў у Афганістане, Іраку, Лівіі, Пакістане, Самалі, Сірыі і Емене з 2001 года, ахвярамі якіх сталі 48 тысяч мірных жыхароў. З пачатку XXI стагоддзя Злучаныя Штаты правялі ваенныя аперацыі ў 85 краінах у імя «барацьбы з тэрарызмам», якія непасрэдна забралі жыцці каля мільёна цывільных асоб і прывялі да перамяшчэння 38 мільёнаў чалавек.

Злучаныя Штаты ўвялі больш аднабаковых санкцый, чым любая іншая краіна ў свеце, і захоўваюць іх у дачыненні да больш як 20 краін, што прыводзіць да няздольнасці тых, супраць каго яны накіраваны, забяспечыць сваё насельніцтва асноўнымі прадуктамі харчавання і медыкаментамі. Іміграцыйнае пытанне стала інструментам міжпартыйнай барацьбы, прымушаючы бежанцаў сутыкацца з крайняй ксенафобіяй і жорсткім абыходжаннем. У мінулым годзе на граніцы краіны арыштавалі рэкордную колькасць мігрантаў — амаль 2,4 мільёна чалавек, а колькасць загінулых дасягнула 856 чалавек, што з'яўляецца самым найвышэйшым паказчыкам.

Злучаныя Штаты, заснаваныя на каланіялізме, расісцкім рабстве і няроўнасці ў працы, валоданні і размеркаванні, у апошнія гады яшчэ больш угразлі ў багне сістэмных збояў, дэфіцыту кіравання, расавага расколу і сацыяльных хваляванняў. Амерыканскія палітыкі, якія абслугоўваюць інтарэсы алігархаў, паступова страцілі сваю суб'ектыўную волю і аб'ектыўную здольнасць рэагаваць на асноўныя патрабаванні простых людзей і абараняць асноўныя правы звычайных грамадзян, а таксама не здолелі вырашыць уласныя структурныя праблемы ў галіне правоў чалавека. Замест гэтага яны бессэнсоўна выкарыстоўваюць правы чалавека ў якасці зброі для нападаў на іншыя краіны, адзначаецца ў дакладзе Прэс-канцылярыі Дзяржсавета КНР, ствараючы канфрантацыю, раскол і хаос у міжнароднай супольнасці, і, такім чынам, сталі перашкодай глабальнаму развіццю правоў чалавека.

**Захар БУРАК.**

---

Дыпламатычнае інтэрв'ю

# АГУЛЬНАЕ НЕ ТОЛЬКІ Ў АРНАМЕНЦЕ

## У Беларусі і Палесціны вялікі патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва ў многіх сферах

**Калі гаворка ідзе пра супрацоўніцтва дзвюх краін, у першую чаргу закранаюцца пытанні палітыкі, эканомікі, гандлю. Але не менш важнай для ўзаемаразумення і збліжэння народаў з'яўляецца сфера культуры. Пра тое, як развіваецца гэты кірунак у беларуска-палесцінскіх адносінах, пагутарылі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Дзяржавы Палесціна ў Рэспубліцы Беларусь Ахмедам Махамедам АЛЬ-МАДБУХАМ.**



***— Спадар пасол, калі вы пазнаёміліся з нашай краінай? Якімі былі першыя ўражанні?***

— Гэта было даўно, у часы майго студэнцтва. Яшчэ ў 1990-я гады. Тады я вучыўся ў Маскве, і мы некалькі разоў прыязджалі ў Мінск. Тыя свае ўражанні не памятаю, тады ўсе гарады ў Савецкім Саюзе былі вельмі падобныя. Але калі я прыехаў сюды цяпер, уразіў маштаб горада: шырокія вуліцы, чыста, прыгожа, дагледжана, людзі добразычлівыя, аднолькава стаўяцца да сваіх і замежнікаў, народ прыязны.

***— Паміж нашымі краінамі ўсталяваліся сяброўскія сувязі. Як ацэньваеце стан беларуска-палесцінскіх адносін і перспектывы іх развіцця?***

— Дагэтуль адносіны развіваліся галоўным чынам у палітычнай сферы, і мы ўдзячны Рэспубліцы Беларусь за нязменную падтрымку нашага народа ў міжнародных інстытутах. Я бачу, што ёсць вялікі патэнцыял для развіцця ў эканамічнай, навуковай, культурнай сферах. І ставлю сабе задачу развіваць гэтыя напрамкі.

***— Давайце падрабязней спынімся на культурным супрацоўніцтве. На якім узроўні беларуска-палесцінскія адносіны ў гэтай сферы?***

— Я бачу, напрыклад, што беларуская і палесцінская вышыўка на нацыянальным адзенні маюць вельмі шмат падобных элементаў. І гэта таксама неяк збліжае нашы народы. Калі мы паказваем палесцінскія традыцыйныя ўборы, вашы людзі бачаць, што ў гэтым ёсць і штосьці беларускае. Працуем і над перакладам кніг, мае папярэднікі таксама ўдзялялі гэтаму вялікую ўвагу. Магчымы і абмен фальклорнымі музычнымі гуртамі. Сустракаліся з групай «Тамазур», якая можа паказаць беларускаму гледачу нашы нацыянальныя танцы. А калі яны яшчэ будуць апрануты ў палесцінскія нацыянальныя строі... Бяром удзел і ў розных фестывалях. Калі я прыехаў працаваць у Беларусь, ішла падрыхтоўка да міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Мы атрымалі запрашэнне, і я адразу вырашыў, што трэба ўдзельнічаць. Спытаў у супрацоўнікаў пасольства, ці была раней прадстаўлена наша краіна на ім. Высветлілася, што не. Таму ў экстранным парадку выбралі фільм, але ён, на жаль, не прайшоў адбор. Тады прапанавалі іншую вельмі цікавую стужку, у якой расказваецца пра непаразуменне паміж моладдзю і старэйшым пакаленнем у стаўленні да таго, што адбываецца ў краіне. Атрымаўся цікавы зварот і да вашых гледачоў, і да нашых суайчыннікаў, якія жывуць тут. Лічу, што культурны абмен вельмі важны, бо мы паказваем беларускаму чытачу, гледачу нашы рэаліі. І з дапамогай такой народнай дыпламатыі можна перадаць тое, што не атрымліваецца выказаць, а фільм ці іншы мастацкі твор распавядзе і пакажа. Гэта вельмі важна для абодвух бакоў.

***— Якія тэмы пераважаюць у палесцінскай літаратуры, мастацтве?***

— Асноўная тэма — наша барацьба за незалежнасць. Пішуць, натуральна, і пра каханне, але галоўнае, што хвалюе творцаў, — змаганне за суверэнітэт, свабоду нашай краіны, каб мы, нарэшце, маглі жыць вольна, як усе людзі на Зямлі. Як можа паэт пісаць пра каханне, калі ён едзе з аднаго горада ў іншы і павінен праходзіць 10-15 кантрольных пунктаў. Таму, хочаш не хочаш, будзеш пісаць пра гэта.

***— Ці ёсць у палесцінскіх дзеячаў культуры цікавасць да Беларусі?***

— Несумненна, ёсць. Таму што кожная краіна для пісьменніка, мастака, рэжысёра — гэта новыя магчымасці. У часы Савецкага Саюза многія нашы пісьменнікі бывалі ў Беларусі. У мяне няма дакладнай інфармацыі, ці прыязджаў хтосьці апошнім часам, але, думаю, прыязджалі. Таму што вашу краіну наведваў наш цяперашні прэзідэнт яшчэ да ўступлення на гэтую пасаду. Ён прыязджаў як прыватная асоба, і з ім былі і палітыкі, і пісьменнікі. Мы цяпер рыхтуем зборнік вершаў сарака палесцінскіх жанчын-паэтэс, які хацелі б прадставіць беларускаму чытачу. Вядзём перагаворы з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, каб дапамаглі з перакладам твораў на беларускую мову і вашы чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з нашай літаратурай, культурай.

***— Якія культурныя мерапрыемствы плануе праводзіць Пасольства Дзяржавы Палесціна ў Рэспубліцы Беларусь?***

— У мяне вялікія планы. Калі працаваў у Балгарыі, мы сумесна з іншымі азіяцкімі пасольствамі праводзілі «Азіяцкі фестываль («Asian festival»). Кожны год прыдумвалі новую тэму: «Магія Усходу», «Каштоўнасці Азіі», «Скарбы Усходу» і г. д. Плануем і тут, у Мінску, арганізаваць падобнае мерапрыемства, аб'яднаць усе азіяцкія краіны, пасольствы якіх ёсць у Беларусі, на адным фестывалі, дзе будуць прадстаўлены і кнігі на рускай і беларускай мовах, і кухня, і музыка, і танцы, і мастацкія выстаўкі. Плануем рабіць гэта ў летні час (чэрвень, ліпень) пад адкрытым небам. А другі фестываль зрабіць асобна для блізкаўсходніх краін, дзе таксама будзе дэманстравацца іх культура. Складаней справа ідзе з тэатрам, бо трэба прывезці з Палесціны акцёраў, дэкарацыі, што цяпер зрабіць даволі няпроста. Але ў нас ёсць і тэатр аднаго акцёра. Думалі аб гэтым і паспрабуем арганізаваць.

***— А ў тэатральных фестывалях, якія праводзяцца ў Беларусі, ваша краіна ўдзельнічае?***

— Мы бралі ўдзел у фестывалі нацыянальных культур у Гродне, у іншых гарадах. У нас ёсць калектыў, які заўсёды ўдзельнічае ў такіх мерапрыемствах з песеннай, танцавальнай праграмай.

***— Цяпер вялікая ўвага надзяляецца развіццю турызму. Чым можа прыцягнуць наша краіна грамадзян Палесціны?***

— Лічу, што кожная краіна ўнікальная па-свойму. Таму, несумненна, палесцінскім турыстам ёсць што паглядзець у Беларусі. У вас вельмі прыгожая, прывабная краіна з цікавай архітэктурай, прыязнымі людзьмі. Турыстам будзе тут утульна. Любы замежнік адчуе сябе ў бяспецы, што вельмі важна. Думаю, і беларусам будзе цікава наведаць Палесціну. У першую чаргу гэта рэлігійны турызм: Сабор Уваскрэсення Хрыстова, Базіліка Нараджэння Хрыстова, Капліца Ушэсця — яны знаходзяцца ў Палесціне. Таму кожны хрысціянін у свеце абавязаны хаця б аднойчы наведаць нашу краіну. Лічу, мы павінны развіваць узаемны турызм. Я звязваўся з некалькімі турыстычнымі арганізацыямі ў Палесціне, каб дапамагчы ім наладзіць супрацоўніцтва з беларускімі турыстычнымі агенцтвамі. Гэта нялёгкая праца, і час цяпер няпросты. Дастаўляць турыстаў вельмі цяжка. Складанасць толькі ў гэтым. А перспектывы развіцця ў гэтым плане велізарныя, і я не сумняваюся, што праз некаторы час усё будзе ў парадку.

***— Па вашым меркаванні, пра што беларусы ў першую чаргу павінны ведаць, калі казаць пра Палесціну?***

— Палесціна была, ёсць і будзе. Мы хочам, каб вы падтрымалі нас, каб наша краіна нарэшце набыла рэальную незалежнасць. Таму што наш народ мае права быць вольным, як і ўсе народы свету, як жывуць беларусы на сваёй зямлі...

**Гутарыў Аляксей ЧАРОТА.**

---


Организация: **ОАО «Белсчеттехника»**

Учетный номер плательщика: 100064838. Вид экономической деятельности: ремонт машин и оборудования общего и специального назначения
Организационно-правовая форма: акционерное общество. Орган управления: Совет Директоров. Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2022 г.**

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 34 366 | 15 803 |
| Нематериальные активы | 120 | 10 | 35 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 33 | 33 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | 1 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **34 409** | **15 872** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1 207 | 1 635 |
| в том числе | | | |
| материалы | 211 | 720 | 1 037 |
| готовая продукция и товары | 214 | 487 | 598 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 62 | 24 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 6 | 6 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1 282 | 1 064 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 3 650 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 323 | 1 881 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **7 530** | **4 610** |
| **БАЛАНС** | **300** | **41 939** | **20 482** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2022 года | На 31 декабря 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 8 776 | 8 776 |
| Резервный капитал | 440 | 1 | 1 |
| Добавочный капитал | 450 | 25 330 | 6 296 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 6 529 | 3 800 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **40 636** | **18 873** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств кредиты и займы | 620 | - | 300 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 302 | 1 308 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 24 | 10 |
| по авансам полученным | 632 | 379 | 453 |
| по налогам и сборам | 633 | 489 | 524 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 92 | 73 |
| по оплате труда | 635 | 266 | 217 |
| прочим кредиторам | 638 | 52 | 31 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 1 | 1 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 303** | **1 609** |
| **БАЛАНС** | **700** | **41 939** | **20 482** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2022 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2022 года | За январь – декабрь 2021 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 10 291 | 10 074 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (7 257) | (7 544) |
| Валовая прибыль | 030 | 3 034 | 2 530 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 425) | (1 253) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 1 609 | 1 277 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 256 | 65 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (251) | (486) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 2 614 | 856 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 512 | 154 |
| В том числе | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 377 | 33 |
| проценты к получению | 103 | 135 | 121 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (179) | (29) |
| в том числе | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (179) | (29) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 152 | 21 |
| в том числе | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 149 | 21 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 3 | |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (150) | (74) |
| в том числе | | | |
| проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (150) | (74) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 335 | 72 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 2 949 | 928 |
| Налог на прибыль | 160 | (327) | (194) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 2 622 | 734 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 19 141 | |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | (42) |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 21 763 | 692 |

ОАО «Белсчеттехника» УНН 100064838

5-6. Информация о дивидендах и акциях

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 558 | 559 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 557 | 558 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 37,04 | 17,20 |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 228 | 260 |
| 9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): сервисные услуги (ремонт и техническое обслуживание техники) – 46,2 %, сдача в наем недвижимости – 42,0 % | | | |
| 10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 30 марта 2023 г. | | | |
| 14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: www.oao-bst.by | | | |

**АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ**

***Временно исполняющему обязанности генерального директора Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» Астапову Виталию Николаевичу***

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит бухгалтерской отчетности Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники», состоящей из: бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2022 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, расчета стоимости чистых активов на 31 декабря 2022 года, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

Место нахождения: Республика Беларусь, 220114, г. Минск, ул. Франциска Скорины, д. 14, каб. 226.

Сведения о регистрации: свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации: Минский горисполком решением от 17 июля 2000 года № 792 зарегистрировал Открытое акционерное общество «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064838. УНП: 100064838.

Открытое акционерное общество «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» создано приказом Минского городского комитета по управлению государственным имуществом и приватизации Республики Беларусь от 21.12.1994 № 421 путем преобразования государственного предприятия «Минский опытно-экспериментальный завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» в соответствии с законодательством об акционерных обществах.

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» по состоянию на 31 декабря 2022 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Директор ООО «ВЕДАудит» А.А. Филонов

Информация об аудиторской организации: Общество с ограниченной ответственностью «ВЕДАудит».
Место нахождения: 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 103, офис № 502.
Сведения о регистрации: Минским городским исполнительным комитетом 04 июня 2013 года в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей внесена запись о государственной регистрации за № 192007642.

Дата подписания аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности: 28.03. 2023 г.